УДК 930(476)«17/18»

**Н.К. Тукайла,**
*аспірант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ДАСЛЕДАВАННІ АЙЧЫННЫХ ГІСТОРЫКАЎ ГІСТАРЫЯГРАФІІ АГРАРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.

Вывучэнне сацыяльна-эканамічных праблем гісторыі Беларусі выступае адным з прыярытэтных напрамкаў гістарыяграфіі. Даследаванне генезісу капіталізму і сёння з'яўляецца адным з актуальных пытанняў гістарычнай навукі. Агляд эканамічнага мінулага Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. прадстаўлены даволі шырока, аднак менавіта даследаванне аграрных адносін перыяду разлажэння феадальна-прыгонніцкіх, зараджэння і станаўлення буржуазных адносін не знайшлі свайго вычарпальнага аналізу.

Першыя гістарыяграфічныя агляды аграрнай гісторыі Беларусі даследуемага перыяду адносяцца да 50–60-х гг. XX ст. і прадстаўлены ва ўступных частках манаграфічных прац савецкіх гісторыкаў сацыяльна-эканамічнай накіраванасці. У рамках сваіх даследаванняў яны рабілі гістарыяграфічны аналіз літаратуры, акцэнтуючы ўвагу на тэматыцы сваіх прац. Праца Д.Л. Пахілевіча «Крестьяне Белоруссии и Литвы в XV–XVIII вв.» (Львоў, 1957 г.) заклала пачатак гістарыяграфічным даследаванням аграрнай праблематыкі. Наступныя артыкулы «Капиталистические зигзаги в истории феодального поместья» (М., 1961 г.), «Крестьяне – слуги в Великом Княжестве Литовском в XVII–XVIII вв.» (М., 1962 г) і праца «Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII в.» (Вільнюс, 1966 г.) сталі лагічным працягам папярэдняга даследавання. Галоўная заслуга ў абагульненні папярэдніх навуковых даследаванняў і абазначэнні новых кірункаў для аналізу: зямельны надзел сялян, віды і памер павіннасцей, сельская абшчына, формы барацьбы сялян супраць феадальнай залежнасці. Аднак усё пералічанае тычыцца аграрнай гісторыі, непасрэдна гістарыяграфічнага аналізу амаль няма. Наступным крокам у гістарычнай навуцы Беларусі стала манаграфія М.М. Улашчыка «Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. В Литве и Западной Белоруссии» [1], у якой былі прааналізававы працы, апублікаваныя ў перыяд 1948–1963 гг., на новым, не ўведзеным у навуковы ўжытак фактычным матэрыяле. Аўтар таксама спасылаўся на архівы і літаратуру па асноўных пытаннях, якія ён закранаў у сваёй манаграфіі (дэмаграфічныя працэсы сярод сельскіх жыхароў, формы землекарыстання, галіны гаспадаркі, стан сялянскай і памешчыцкай гаспадаркі, рыначныя сувязі і сялянскія рухі напярэдадні рэформы). Аднак гістарыяграфія пытання не выходзіла за рамкі тэмы працы. Працягам гістарыяграфічнага агляду аграрнай гісторыі Беларусі XVIII ст. з'яўляецца манаграфія П.Р. Казлоўскага «Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII– XVIII в.» (Мінск, 1969 г.), дзе ва ўступнай частцы прааналізаваны работы па аграрнай гісторыі Беларусі і Вялікага Княства Літоўскага XVI – XVIII стст. як буржуазных гісторыкаў, так і апошнія для таго часу працы Д.Л. Пахілевіча, які, на думку П.Р. Казлоўскага, мае «принципиальное значение для изучения аграрной истории Белоруссии» [2, с. 6], артыкулы В.І. Мялешкі. Аднак аналіз літаратуры – гэта не гісторыя пытання з крытычнымі ацэнкамі. Да той жа катэгорыі гістарыяграфічных аглядаў у рамках манаграфічных прац адносяцца работы В.У. Чапко «Сельское хозяйство в Белоруссии в первой половине XIX века» (Мінск, 1966 г.) і «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в.» (Мінск, 1972 г.), дзе даволі аднабакова прааналізавана літаратура савецкага перыяду, уключаючы самыя апошнія артыкулы таго часу, з акцэнтам на сялянскія рухі, што абумоўлена назвай работы. Такім чынам, была зроблена спроба запоўніць прабелы ў даследаванні гісторыі сялянскай барацьбы ў Беларусі ў першай палове XIX ст. – пераломным перыядзе сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, аднак не якім чынам не гістарыяграфіі пытання.

Якасна новым этапам у развіцці гістарыяграфіі гісторыі Беларусі стаў перыяд 80-х гг. XX ст., калі адразу выйшла некалькі прац, прысвечаных менавіта гістарычнай навуцы. Адной з першых з'яўляецца работа У.М. Міхнюка «Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941)». У падраздзеле «Историография феодальной Белоруссии» [3] зроблены пералік манаграфій, артыкулаў і дысертацый указанай праблематыкі па розных кірунках (сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, нацыянальнай і канфесійнай гісторыі). Што тычыцца разглядаемага намі перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. і аграрнай гісторыі ў прыватнасці, то была зроблена спроба абазначыць актуальныя праблемы, пералічыць працы гісторыкаў і даць ім ацэнку. Такім чынам, сцвярджалася, што гісторыкі 20–30-х гг. мінулага стагоддзя правялі навуковы аналіз асноўных праблем па гісторыі Беларусі эпохі феадалізму і дасягнулі значных поспехаў пры разглядзе сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэта выступіла перадумовай для прац, напісаных у 30–40-я гг. XX ст. з марксісцка-ленінскіх метадалагічных пазіцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Істотнай у гістарычнай навуцы Беларусі з'явілася работа З.Ю. Капыскага і В.У. Чапко «Историография БССР (эпоха феодализма)» (Мінск, 1986 г.) – вучэбны дапаможнік, у якім зроблены значны аналіз літаратуры. Былі прааналізаваны працы па аграрнай гісторыі позняга феадалізму даваеннага і пасляваеннага часу. Аднак аналіз шырокага кола крыніц дадзены аднабакова, зыходзячы з ідэалогіі свайго часу. У крытычных ацэнках папярэдніх гісторыкаў аўтары таксама не размяжоўвалі паняцце «разлажэнне феадальна-прыгонніцкіх адносін і зараджэнне новых – капіталістычных». У 1987 г. выйшла сумесная праца У.М. Міхнюка і П.Г. Петрыкава «Историческая наука Белорусской ССР в 80-е гг.», дзе ўжо былі пералічаны працы П.Г. Казлоўскага, А.М. Лютага, В.У. Чапко і В.І. Мялешкі. Станоўчым момантам работы можна назваць тое, што слушна былі пералічаны пытанні, якія, на думку аўтараў, даследаваны недастаткова поўна і глыбока. Яны назвалі перспектыўнымі для вывучэння такія сюжэты, як гісторыя мануфактуры, гандлю і фінансаў, што важна для высвятлення дыялектыкі генезісу капіталізму ў Беларусі [4, с. 57].

Вельмі цікавым з'яўляецца артыкул В.І. Мялешкі і У.М. Міхнюка «Сучасная савецкая гістарыяграфія аграрнай гісторыі дакастрычніцкай Беларусі» (1987 г.), у якім былі расстаўлены акцэнты ў перыядах даследавання аграрнай гісторыі Беларусі і найбольш поўна адлюстраваны недахопы і белыя плямы ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі. Было адзначана, што буржуазныя гісторыкі Польшчы і Расіі ў канцы XIX – пачатку XX ст. выявілі і сістэматызавалі фактычны матэрыял па аграрнай прабематыцы [5, с. 115]. Наступным этапам у даследаванні аграрнай гісторыі, якое грунтавалася на марксісцка-ленінскай метадалогіі, сталі 20–30-я гг. XX ст. Гэты перыяд вышэйназваныя гісторыкі адзначалі «сапраўды навуковым» у даследаванні асобных аспектаў аграрнай тэматыкі феадальнай і капіталістычнай гісторыі Беларусі [5, с. 115]. Аўтарамі прыводзілася шырокае кола манаграфічных прац і іх аналіз, аднак указвалася на непаўнату даследаванняў і непаслядоўнасць раскрыцця праблем у храналагічным і тэматычным планах. Адзначалася, што «лепш вывучаны перыяд другой паловы XVII – XVIII ст., значна слабей – XVI – першая палавінаXVII ст… схематычна даследавана гісторыя сялянства больш ранняга перыяду, маюць патрэбу ў паглыбленым разглядзе гэтыя ж аспекты ў прымяненні да першай палавіны XIX ст.»[5, с. 116]. Недастаткова распрацаванымі называліся праблемы сацыяльна-эканамічнага становішча сялян: формы эксплуатацыі, павіннасці і катэгорыі сялян; рынач-ныя сувязі сялянскага двара, сельскае рамяство і сялянскія промыслы [5, с. 116].

Лагічна, што ў пачатку 90-х XX ст. публікуюцца грунтоўныя працы па гісторыі сялянства: П.А. Лойка «Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя рэнты ў другой палове XVI–XVIII стст.» (Мінск, 1991 г.), манаграфія В.Ф. Голубева «Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне Беларусі XVI–XVIII стст.» (Мінск, 1992 г.) і калектыўная трохтомная праца «Гісторыя сялянства Беларусі», першы том якой быў выдадзены ў 1997 г. у Мінску. Усе гэтыя працы грунтуюцца на шырокім коле крыніц і даследаваннях папярэдняга перыяду.

Вяртаючыся да гістарыяграфічнага агляду, трэба адзначыць наступную абагульняючую працу, у якой даецца грунтоўны аналіз гістарыяграфіі па праблеме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. В.Ф. Касовіча і А.М. Лютага «Гістарыяграфія і крыніцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой паловеXVIII – першай палове XIX ст.» [6]. Аднак і гэта работа была выканана з марксісцка-ленінскіх пазіцый. Зусім па-іншаму выкладзена гістарыяграфія ў манаграфіі А.М. Лютага «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII –першай палове XIX стагоддзя» [7], дзе аўтар параўнаў узроўні распрацаванасці указанай тэмы і звярнуў увагу навукоўцаў на складаныя пытанні, якія патрабуюць пашыранага вывучэння з мэтай аб'ектыўнага раскрыцця праблемы.

На рубяжы вякоў яшчэ большую актуальнасць набываюць праблемы гістарыяграфіі: падводзяцца вынікі даследаванняў на канферэнцыях, пераасэнсоўваюцца матэрыялы і акрэсліваюцца малавывучаныя праблемы. З 2006 г. друкуюцца асобныя зборнікі, прысвечаныя менавіта гістарыяграфіі: Інстытут гісторыі – зборнік «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы». Кожны год, пачынаючы з 2006 г., друкуецца зборнік «Працы гістарычнага факультэта БДУ», навукоўцы БДПУ апублікавалі зборнік «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША». Знаходзяць сваё адлюстраванне гістарыяграфічныя даследаванні і ў публікацыях розных навукова-тэарэтычных канферэнцый. Па-іншаму даследуюцца і праблемы аграрнай гісторыі. А.Л. Кіштымаў у артыкуле «Рынак Беларусі: асвятленне ў працах эканамістаў гісторыкаў» адзначае, што «шэраг прынцыповых пытанняў эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. застаецца ў разрадзе дыскусійных або наогул не вывучаных. Адсутнічаюць абагульняльныя працы па гісторыі ўнутранага і знешняга гандлю Беларусі. Пытанні, што заставаліся канчаткова вырашаныя савецкай гістарыяграфіяй, сёння ўжо не выглядаюць пераканаўча даследаванымі і імкліва перайшлі ў лік важных і актуальных даследчыцкіх задач» [8, с. 199]. У выніку гістарыяграфічнага аналізу аўтар робіць выснову аб тым, што дыскусійным застаецца і «пытанне аб глыбіні пранікнення капіталістычных адносін у сельскую гаспадарку»[8, с. 209]. На недахопы пры асвятленні праблемы фарміравання ўнут-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ранага рынку Беларусі, працэсы генезісу капіталізму ўказвае і А.А. Цобкала ў артыкуле «Некаторыя пытанні айчыннай гістарыяграфіі праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў перыяд позняга феадалізму» [9].

Закранаецца гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. у гістарыяграфічным аналізе В.Ф. Голубева [10], В.В. Кірыленкі [11]. А.Э. Лютая ў артыкуле «Отечественная историография 20–50-х гг. XX в. о социально-экономическом развитии Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в.» робіць выснову аб тым, што для савецкіх гісторыкаў характэрны перанос агульнарасійскіх характарыстык сацыяльна-эканамічных працэсаў у перыяд позняга феадалізму на свой рэгіён, а таксама атаясамліванне розных па сваёй сутнасці працэсаў разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і зараджэння капіталістычных адносін [12, с. 100].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што першыя спробы даследавання гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. адбыліся у канцы 50-х гг. мінулага стагоддзя, у аснову якіх былі пакладзены працы гісторыкаў 20–30-х гг. XX ст. Гэта былі агляды вузкай накіраванасці, якія тлумачыліся выбарам тэмы даследавання. 60–90-я гг. мінулага стагоддзя – гэта перыяд асаблівай цікавасці да аграрнай праблематыкі. З сярэдзіны 80-х гг. XX ст. з'яўляюцца працы менавіта па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, якія зыходзілі з марксісцка-ленінскай метадалогіі.

З пачаткам новага тысячагоддзя гістарыяграфія аграрнай праблематыкі зноў набывае сваю актуальнасць. Гісторыкі пераасэнсоўваюць многія метадалагічныя ўстаноўкі, падводзяць вынікі і акрэсліваюць напрамкі для далейшага даследавання.

ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. *Улащик, Н.Н.* (1906–1986). Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н.Н. Улащик. – М.: Наука, 1965. – 478 с.
2. *Козловский П.Г.* Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в. / П.Г. Козловский. – Минск: Наука и техника, 1969. – 201 с.
3. *Михнюк, В.Н.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В.Н. Михнюк. – Минск: Наука. – 284 с.
4. *Михнюк, В.Н.* Историческая наука Белорусской ССР в 80-е гг. / В.Н. Михнюк, П.Г. Петриков. – Минск: Наука и техника. – 120 с.
5. *Мялешка, В.І.* Сучасная савецкая гістарыяграфія аграрнай гісторыі дакастрычніцкай Беларусі / В.І. Мялешка, У.М. Міхнюк // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1987. – № 4. – С. 115–122.
6. *Касовіч, В.Ф.* Гістарыяграфія і крыніцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / В.Ф. Касовіч., А.М. Люты. – Мінск: БДПУ, 1996. – 93 с.
7. *Люты, А.М.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя: манаграфія / А.М. Люты. – Мінск: БДПУ, 2004. – 320 с.
8. *Кіштымаў, А.Л.* Рынак Беларусі: асвятленне праблем у працах эканамістаў і гісторыкаў / А.Л. Кіштымаў // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н.В. Анофранка і інш. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – С. 193–227.
9. *Цобкала, А.А.* Некаторыя пытанні айчыннай гістарыяграфіі праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў перыяд позняга феадалізму / А.А. Цобкала // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 23 лют. 2007 г.: да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі / рэдкал. А.І. Андарала і інш. – Мінск: БДПУ, 2007. – С. 33–36.
10. *Голубеў, В.Ф.* Сельская абшчына XVI–XVIII стст. у айчыннай гістарыяграфіі / В.Ф. Голубеў // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 сак. 2008 г.: у 2 ч. / Рэдкал.: В.А. Пілецкі (адк. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2008. – Ч. 1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (ад старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.). – С. 54–58.
11. *Кірыленка, В.В.* Расійская аграрная палітыка ў Беларусі канца XVIII – першай трэці XIX ст. у міжваеннай гістарыяграфіі / В.В. Кірыленка // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 сак. 2008 г.: у 2 ч. / рэдкал: В.А. Пілецкі (адк. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2008. – Ч. 1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (ад старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.) – С. 74 – 77.
12. *Лютая, А.Э.* Отечественная историография 20–50-х гг. XX в. в социально-экономическом развитии Беларуси во второй половине XVIII – первой половине XIX в. / А.Э. Лютая // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 сак. 2008 г.: у 2 ч. / рэдкал.: В.А. Пілецкі (адк. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2008. – Ч. 1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі (ад старажытных часоў да кастрычніка 1917 г.) – С. 97–101.

SUMMARY

*The article analyzes Native historiography of agrarian history of Belarus at the end of XVIIIth – the first half of the XIXth century. Identified issues, which remained unsolved until the end of the Soviet historiography passed today in a number of current research problems. The need in deep study of the historiography of agrarian history of Belarus is underlined.*

Паступіў у рэдакцыю 09.02.2012 г.

*УДК 930(476)(1–21)*

***А.А. Пруднікаў,***
*магістрант кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ПРЫВАТНАЎЛАСНІЦКІЯ ГАРАДЫ І МЯСТЭЧКІ БЕЛАРУСІ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

Апошнія дзесяцігоддзі на постсавецкай прасторы адзначаюцца як час вяртання да сваёй гістарычнай спадчыны. Гэта адбываецца не толькі ў рамках сям'і або іншай замкнёнай групы, але нават і ў межах цэлых асобных народаў. Пачынаючы з канца 1980 – пачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ